**Петрачэнка, С.** Горкасць палыну / С. Петрачэнка // Прамень камунізму (Гарадок). — 1989. — 23 лют. — С. 2.

## ГОРКАСЦЬ ПАЛЫНУ



Ён любіў катацца на кані. Любіў вудзіць рыбу. Ціхі, спакойны, душэўны – гэтыя якасці Васіля без сумнення фарміравала прырода, такая шчодрая ў тутэйшых мясцінах. А хто з нас, хлопчыкаў з вёскі, не любіў ранкам, калі толькі заспяваюць першыя птушкі, схапіць вуду – і на чароўнае возера. І на кані смела пагарцаваць – запаветная мара кожнага падлетка.

Васілій быў такім, як і мы, яго аднагодкі. Амаль у адзін год і прызываліся ў армію. Нас чакалі цяжкія, поўныя небяспекі дні службы ў Афганістане. Мы вярнуліся, а Васілій Антонаў...

У той дзень, калі апошні савецкі салдат пакінуў Дэмакратычную Рэспубліку Афганістан, да мяне зайшлі старшыня савета воінаў-інтэрнацыяналістаў Валерый Адаменка і сакратар савета Аляксандр Няелаў:

– Давай, дружа, з'ездзім наведаем бацькоў Антонава. Ім сёння, мабыць, цяжэй за ўсіх.

Мы часта бываем у школах, выступаем. І заўсёды нашы невясёлыя ўспаміны «разбаўляюцца» цікавасцю і непасрэднасцю вучняў. А вось ехаць да бацькоў загінуўшага таварыша непамерна цяжка. Быццам віну адчуваеш перад імі, што засталіся жывымі.

...У Вярэцкай сярэдняй школе памяць свайго былога вучня Васілія Антонава берагуць як зрэнку вока. 6 клас, дзе класным кіраўніком Людміла Сяргееўна Дзмітрыева, носіць імя Антонава. У класе афармлен куток земляка-інтэрнацыяналіста. Будуецца новая школа. Хутчэй за ўсё яна таксама будзе насіць Імя Васілія Антонава. Так жадаюць настаўнікі і вучні Вярэцкай СШ. Няхай так і будзе.

Нельга без болю і хвалявання гартаць альбом са шматлікімі фотаздым-камі. Часта ў школу прыходзяць бацькі Аляксей Аляксандравіч і Анастасія Васільеўна Антонавы.

– Ні адзін гераічны прыклад з літаратуры не ўздзейнічае так на вучняў, як расказ пра загінуўшага земляка ў мірны час, – гаворыць настаўніца рускай літаратуры Людміла Сяргееўна.

І інакш быць не можа. Дзесяцікласнік Сяргей Пруднік сябраваў з Васіліем Антонавым. І хоць розніца ў гадах была значная, Васілій ніколі не крыўдзіў свайго малодшага сябра. Іх двое было з вёскі Дуброва, хадзілі разам у школу. І вудзілі рыбу разам. Як жа можна выкрэсліць в памяці тое, што прырасло да сэрца кожнай клетачкай? І дзе б ні быў Сярожа, у якія б цяжкія сітуацыі ні трапляў, верыцца, памяць аб сябры будзе з ім.

У 6 класе кожны дзень нябачна прысутнічае Васілій Антонаў. Парта, дзе сядзеў ён, мае вы-сокі стымул для сённяшніх падлеткаў. Лепшыя з лепшых маюць гонар сядзець за ёй. Такога права ўдастоен Яфім Кухараў. Хто на чарзе?

І зноў адбыўся незапланаваны урок мужнасці. Валерый Адаменка расказаў вучням, як у 1979

годзе ён у складзе першых савецкіх воінаў уступіў на далёкую афганскую зямлю, каб аказаць інтэрнацыянальную дапамогу. Аляксандр Няелаў служыў якраз у тыя гады, што і Васілій Антонаў. Удзельнічаў у баях, у адным з іх, выцягваючы з-пад душманскага абстрэлу параненага сябра узбека Рамана, ён сам быў цяжка паранены. Узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі.

– Ведаеце, што самае важнае было для нас на чужбіне, – казалі мы школьнікам, – гэта верны сябар побач, на якога можна ў любую хвіліну пакласціся. Тады і сам адчуваеш сябе дужэйшым, упэўненым.

Дарога ляжала на Дуброва. І чым бліжэй пад'язджалі, тым больш хваляваліся. Нас сустрэлі як старых знаёмых. Анастасія Васільеўна і Аляксей Аляксандравіч без лішніх эмоцый узялі даведку, дзе гаварылася аб прывілеях, прадастаўленых сем´ям загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Гаспадыня зусім занядужыла. Усё па бальніцах блукае, – гаварыў Аляксей Аляксандравіч. – Калі што, дык выклікаць «хуткую» нельга. Тэлефона пакуль няма, абяцаюць. А калі будзе?

Мы даўно вядзём пра гэта гаворку. Па вясне абяцаюць.

Гаварылі пра ўсё, толькі не пра сына. Тужлівыя вочы бацькоў да гэтага часу не прасыхаюць ад слёз, хоць і прайшло чатыры гады.  Паабяцалі пад'ехаць праз колькі дзён, каб пакалоць дровы. А што мы  можам яшчэ?

Дамоў вярнуліся моўчкі. Прыгадвалася сачыненне  дзевяцікласніцы Галіны  Шчарбаковай, якая пісала: «Праходзіць час, але не забываюць былыя воіны-інтэрнацыяналісты крутыя горныя сцяжынкі, ледзяны пранізлівы вецер-«афганец», посвіст душманскіх куль. Гэта памяць  неабходна і нам, каб усё сваё жыццё рыхтаваць сябе да подзвігу».

У адзін са студзеньскіх дзён 1985 года, выконваючы баявое заданне, Васілій Антонаў наскочыў на міну. На імгненне, быццам на экране, праплылі родныя краявіды з сінявокімі азёрамі, родны дом з бацькамі і…нясцерпны пах палыну…Назаўсёды.

Васілій Антонаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**С. Петрачэнка, былы воін-інтэрнацыяналіст**